# К ПРАЕКТУ ЗАКОНА АБ ПРЭЗЫДЭНЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Modern History Archives
Archiū Najnoŭšaje Historyi
Fond 9(14)(64)(35)

Ілганне,абман,ашуканства,дэмагогія,папулізм,абяцанкі у ідэалагічнай прапагандзе бальшэвікоу,барадзьбе за сваё панаванне,займалі і займаюць важнейшае месца.Яны былі на узбраенні аграмаднай арміі прапагандыстау-палітработнікау:камісарау,палітрукоу,агітатарау,партыйных лектарау.У свой час адным із іх быу і наш цяперашні прэзыдэнт А.Р.Лукашэнка.Партыя сваіх выхаванцау вучыла,што дзеля дасягнення яе мэтау можна не толькаілгаць,абманываць,але і прадаць самых родных табе людзей.

Гэтыя бальшэвіцкія прынцыпы у барадьбе за уладу і узяу бну на вааружэнне прыкладны выкаванец КПСС - барадзьбіт за пасаду прэзыдэнта РБ А.Р.Лукашэнка.Ён правільна ацаніу псіхалагічны стан даведзеных да адчаю пераважнай большасці грамадзян Беларусі: людзі паверылі у яго папулізм і дэмагогію.

А.Р.Лукашэнка завярау будучых выбаршчыкау,што калі ён будзе абраны прэзыдэнтам вот як добра зажывецца:ужо з Новага 1995 года:

1)на усю моц запрацуюць усе прадпрыемствы,заводы;

2)не будзе беспрацоуных;

3)пакончыць з карупцыяй,прыхватызацыяй,шпікуляцыяй;

4)жыццёвы узровень будзе не апускацца "ніжэй калена"(яго выраз),а падымацца уверх у напрамку пупа;

5)грамадзянам,абрабаваным камуністычнай дзяржавай у ашчадным банку, у якіх былі грашовыя уклады да 1991 г.,будуць вернуты грошы у тадышняй пакупальнай іх здольнасці.

У Беларусі кажуць: Абяцанка - цацанка,а дурню радасць. Экстрасэнсы А.Р.Лукашэнкі авалодалі масамі : 82% выбаршчыкау прагаласавалі "за".А цяпер яны,як мой дзяцька Сымон,прайграушы у рулетку Яшку грошы,выручаныя за парасят,чэшуць патыліцы.А як жа не часаць: абяцанкі А.Р.Лукашэнкі аказаліся пацехай для дурняу: жыцевы узровен паднялся не вышэй калена,а апусціуся да шчыкалатак.Кароль аказауся

голы.Тады ж пасля выбарау прэзыдэнта поспех А.Р.Лукашэнкі лічылі ашаламляючым,а самі выбары - дэмакратычнымі.

У энэргічнага барадзьбіта з карупцыяй,aкончыушага два вузы,выхадца із беларускіх сялян прастыя,некампетэнтные людзі проста павэрылі як у збавіцеля ад усіх бед.Такое здарылася не толька у Беларусі.Згодна з афіцыйнай статыстыкай,Лявон Тэр Пэтрасян(Арменія)атрымау у І99Іг.83% галасоу,Аскар Акаеу(Кіргізія) - 95%; Мірча Снегур - 98,2% галасоу; Сапармурад Ніязау у І992г. 99,5%(Туркменія).А у студзені І994 г. - 99,99% - як Сталін пры Савецкім Саюзе.

Што датычыць дэмакратычнасці выбарау.Можна было бы лічыць перамогу А.Р.Лукашэнкі дэмакратычнай,каб ен перад выбарамі заведама не ілгау і не абманывау абяцанкамі добрых,даверлівых людзей.Цяпер ужо і усім наіуным прыхільнікам куміра А.Р.Лукашэнкі ясна,што ен іх проста абмануу абяцанкамі.

Можа прэзыдэнт зрабіу штосці добрага для свайго беларускага народа у вобласці мовы,культуры,навукі.І тут - нічога.У прэзыдэнта РБ А.Р. Лукашэнкі зняважліва-грэблівыя адносіны да мовы сваей дзяржавы.Мяока кажучы,ен ігнарыруе Канстытуцыю РБ,па якой дзяржаунай мовай у нас зуляецца беларуская мова,Закон аб мовах у РБ і саму мову.А пытанне аб адраджэнні беларускай мовы - галоунае пытанне адраджэння усей беларускай нацыі у тым ліку і эканомікі.

Такім чынам лічу,што у Законе "Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь"" неабходна каб былі наступныя графы.

І)Кандыдат у прэзыдэнты РБ,стаушы яе прэзыдэнтам абманным шляхам(папулісткія абяцанкі,ілганнё,абман,ашуканства),пазбауляецца мандата прэзыдэнта Вярхоуным Саветам цераз Канстытуцыйны суд.

2) Прэзыдэнт,які ігнарыруе Канстытуцыю РБ і на дзяржаунай працы не карыстаецца сваей дзяржаунай мовай - вярхоуным Саветам цераз Канстытуцыйны суд пазбауляецца прэзыдэнтскага мандата.

Мінск 26.0І.95г. Іван Міронччык (прафесар)

vytoki.net